# ОРГАНЫ СУДОВАЙ УЛАДЫ Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ У X—XV СТАГОДДЗЯХ

**Міхневіч А.А.**

*БДУ (Мінск)*

Нягледзячы на феадальны лад (а ў большасці і дзякуючы яму), які існаваў у краіне, у ВКЛ яшчэ ў дастатутны перыяд сфарміравалася складаная сістэма судовых органаў. Суды дзяліліся на тры падкатэгорыі: а) суды для ўсяго простага насельніцтва – агульныя суды, якія ў сваёй дзейнасці кіраваліся звычайным правам і часткова пісаным законам; б) суды, якія судзілі толькі шляхту і кіраваліся ў сваёй працы выключна пісанымі нормамі заканадаўства; в) саслоўныя суды, якія судзілі асобныя катэгорыі насельніцтва, яны дзейнічалі на аснове царкоўнага, звычайнага права, або спецыяльных нормаў права.

Вышэйшай судовай установай лічыўся Вялікакняжацкі суд, які разглядаў найбольш складаныя і цяжкія злачынствы і з'яўляўся вышэйшай апеляцыйнай інстанцыяй. Колькасць катэгорый спраў, якія мог разглядаць гэты суд, была не абмежавана. Сесіі Вялікакняжайцкага суда праводзіліся штогод у Вільні і папераменна праз год у Мінску і Навагрудку. Пасяджэнне не доўжылася больш чым 22 тыдні, праз гэты тэрмін суд быў абавязаны пераехаць у другі горад.

Поруч з Вялікакняжацкім судом дзейнічалі: суд паноў радных, які вырашаў спрэчкі ў адсутнасці Вялікага Князя і незалежна ад колькасці прысутнічаючых паноў; соймавы суд, які разглядаў справы ў саставе вялікага князя і паноў радных падчас правядзення пасяджэння Сойма; і камісарскі суд, які вырашаў спрэчкі паміж феадаламі, гарадамі, манастырамі, а таксама вялікакняжацкімі і панскімі сялянамі наконт права валодання маёмасцю.

Вялікі князь або паны радныя маглі даручыць разгляд справы камісарскаму суду, аб дзейнасці якога ўпершыню ўзгадваецца ў дакументах XV ст. Камісарскія суды ўзніклі з-за вялікай загружанасці Гаспадарскага суда і ў сувязі з неабходнасцю па некаторых справах, якія паступалі да Гаспадара, выязджаць на месца разгляду канкрэтнай спрэчкі. У старажытных актах гэтыя суды часам называюцца «гаспадарскімі камісіямі», а іх суддзі – «комиссары», «судьи за комиссиями» гаспадарскімі, «ездоки», «дельчьи». Камісарамі былі спецыяльна вызначаныя службовыя асобы (як правіла з ліку рады). Камісары прызначаліся гаспадаром па кожнай справе асобна, і з вынясеннем рашэння іх паўнамоцтвы заканчваліся. У асноўным камісарскі суд разглядаў справы аб размежаванні зямель, аб падзеле маёнткаў паміж спадчыннікамі, аб «речах рухомых» і грашовых прэтэнзіях.

Нараўне з вышэйшымі дзяржаўнымі судамі існавалі і мясцовыя суды, бо без іх існавання не магла правільна функцыянаваць судовая сістэма. Ужо ў

XV ст. пачала ўзнікаць патрэба ў сумяшчэнні цэнтралізацыі і дэцэнтралізацыі ў межах судовага апарата. Гаспадарскі суд і суды аналагічнага ўзроўню не маглі прасачыць за ўсімі неправамернымі дзеяннямі і спрэчкамі, якія адбываліся ў краіне, таму мясцовыя суды былі найбольш загружаныя.

Відавочна, што мясцовыя суды былі больш старажытнымі і пачалі функцыяніраваць за доўгі час да ўзнікнення моцнай дзяржаўнай ўлады. Адным з такіх прыкладаў можна лічыць замкавы (гродскі) суд. Назва гэтага суда паходзіць ад слова горад (або замак), так як са старажытных крыніц вядома, што яго пасяджэнні праходзілі ў замку, сцены якога ў сваю чаргу вызначалі межы буйнога горада, або горада-дзяржавы. Самым жа старажытным з мясцовых судоў быў копны суд. Гэты суд у адрозненне ад гродскіх і земскіх судоў не з'яўляўся дзяржаўным, а адлюстроўваў народную волю. Таксама ён з'яўляўся самым старажытным калегіяльным судом на тэрыторыі ВКЛ. Копныя суды спачатку былі судамі сельскіх абшчын, але вельмі хутка набылі характар мясцовага, але не саслоўнага правасуддзя. Спачатку ён вырашаў спрэчкі паміж усімі слаямі насельніцтва, а, пачынаючы з XVI ст. у асноўным спрэчкі сялян, таму што ён карыстаўся выключна нормамі звычайнага права.

Такім чынам трэба адзначыць, што да выдання Статута ВКЛ 1529 года судовая сітэма на Беларускіх землях была прасякнута звычаем і палажэннямі прэцэдэнтнага права. Судамі, якія вырашалі найбольшую колькасць справаў з'яўляліся гродскія (замкавыя) і копныя суды.

## ОСОБЕННОСТИ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОРГАНОВ ПРОКУРАТУРЫ В ПЕРИОД ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ (1941—1945 гг.)

**Нарушевич М.Е.**

*БГЭУ (Минск)*

Великая Отечественная война 1941-1945 гг. оказала влияние на все сферы жизни общества БССР: экономическую, социальную, духовную и политическую. Эти изменения затронули и органы государственного контроля и надзора, а именно органы прокуратуры.

В соответствии с Указом Президиума Верховного Совета СССР от 22 июня 1941г., объявившим военное положение, работа органов прокуратуры была перестроена на новый лад. Главной целью органов прокуратуры являлась функция надзора за исполнением законов военного времени, направленных на охрану порядка, трудовой и государственной дисциплины. Особое место занимал контроль за детской беспризорностью и безнадзорностью.

Все местные органы государственной власти, прокуратура в том числе, согласно п. 5 Указа обязаны были оказывать полное содействие военному командованию при обеспечении общественного порядка и безопасности.